Весці БДПУ. Серыя 1. 2018. № 3. С. 122–126.

УДК [82-192:398.8](476)

# ПРАЯВЫ ВАРЫЯНТНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІХ ПЕСНЯХ АБРАДА «ВАДЖЭННЯ І ПАХАВАННЯ СТРАЛЫ»

**Н. Г. Мазурына,**
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры тэорыі і методыкі*
*выкладання мастацтва БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 19.06.18.

UDC [82-192:398.8](476)

# VARIABILITY IN BELARUSIAN SONGS OF RITE "DRIVING AND BURIAL OF ARROW"

**N. Mazuryna,**
*PhD in Philology, Associate Professor*
*of the Department of Theory and*
*Methods of Teaching Arts, BSPU*

Received on 19.06.18.

Артыкул прысвечаны аналізу дыяхроннай варыянтнасці структуры і семантыкі беларускіх народных песень веснавога цыклу на матэрыяле песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы» – унікальнага жанру, распаўсюджанага на Беларускім Палессі. Былі прааналізаваны дзясяткі напеваў і тэкстаў песень, запісаных у розных вёсках Пасожжа і Гомельшчыны на працягу XX стагоддзя. Абраду «Ваджэння і пахавання стралы», які бытуе да сённяшняга часу, прысвечаны шэраг даследаванняў. Аднак праца, звязаная з сістэмным аналізам вербальнага і музычнага кампанентаў песень абраду, іх варыянтнасці ў беларускай фалькларыстыцы не праводзілася. Варыянтнасць як адна з першасных уласцівасцяў народнай творчасці мае свае асаблівасці і заканамернасці ў цыкле беларускіх народных песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы».

*Ключавыя словы:* беларускі фальклор, народная песня, веснавыя песні, абрад «Ваджэння і пахавання стралы», варыянтнасць у фальклоры, тэорыя варыянтнасці.

This article analyzes the derivation variability structure and semantics of Belarusian folk songs on the material of the spring cycle songs rite "Driving and burial of arrow" – a unique genre, distributed at the Belarusian Polesie. Dozens of tunes and lyrics were analyzed and recorded in different villages Posozhya and Gomel region during the twentieth century. Rite "Driving and burial of arrow" that exists up to now, is the subject of several studies. However, the work relating to the systematic analysis of verbal and musical components of the songs of the rite as well as their variability in the Belarusian folklore studies have been conducted. Variance as one of the primary properties of folk art has its own characteristics and patterns in a series of Belarusian folk songs rite "Driving and burial of arrow".

*Keywords:* Belarusian folklore, folk song, spring songs, rite "Driving and burial of arrow", variability in folklore, variation theory.

У вусным песенным «слоўніку» народнай традыцыі кожнага этнасу існуе мноства сродкаў для дасягнення мастацкай аформленасці задумы, рэалізацыі семантычнага зместу. Яны вельмі шматлікія, але, як паказвае шматгадовая практыка расшыфроўкі і натацыі беларускіх народных песень, практычна ўсе яны зводзяцца да ўзнікнення серыі заканамернасцей на шляху стварэння кожнага варыянта песні як цэласнага мастацкага твора, завершанага па форме ў адпаведнасці з фабулай песеннага выказвання. Узнікае тая ці іншая формульнасць, структураванасць, а ў іх межах – перыядычнасць у спосабе вуснага песеннага выказвання народнага спевака, якая праяўляецца дыяхронна.

Паколькі народная песня ўяўляе сабой адзінства вербальнага і музычнага пачаткаў, то і заканамернасці стварэння кожнага варыянта песні трэба шукаць у вобласці перасячэння, яднання песнестваральных пачаткаў.

Зразумела, што любы мастацкі твор, у тым ліку і вуснай народнай традыцыі, мае сваё прызначэнне, сэнс і змест, якія потым рэалізуюцца ў матэрыяльным свеце ў мастацкай працэсуальнай форме. Такім чынам, семантыка і структура песні ўтвараюць асноўную і непарыўную сістэму каардынат, у якой адбываецца працэс стварэння і гістарычнага развіцця мноства варыянтаў твораў і іх выкананняў.

Пры ўсёй разнастайнасці абрадавых песень, якія гучаць у дадзены перыяд святочнага календара беларусаў, яны народжаны своеасаблівым светам адкрытай прасторы, светам «пленэрнага» аб'яднання стыхій паэзіі, верша, гука, меласу, спосабаў выканання, фактуры,

танца і г. д. Ужо дзясяткі год прайшлі з таго часу, як даследчыкі беларускага фальклору адкрылі для сябе і грамадскасці абрад «Ваджэння і пахавання стралы». Самыя раннія запісы абраду, песень і карагодаў былі зроблены Е. Р. Раманавым, З. Ф. Радчанка, З. Я. Даленга-Хадакоўскім яшчэ ў другой палове XIX ст. [1]. Апошнія ж запісы праведзены літаральна ў траўні 2018 г. Кожнае пакаленне як бы нанова адкрывае яго для сябе. Але і да сённяшняга часу гэтыя ўнікальныя старажытнейшыя традыцыйныя беларускія песні лакальнага бытавання застаюцца «экзатычнымі» для сучаснай моладзі. Усё сказанае сведчыць аб бясспрэчнай *актуальнасці* тэмы даследавання. *Мэтай* дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз дыяхроннай варыянтнасці структуры і семантыкі беларускіх народных песень веснавога цыклу на матэрыяле песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы».

Сістэма каляндарна-абрадавых песень беларусаў склалася нашмат стагоддзяў раней за з'яўленне пісьмовай літаратуры і тэорыі літаратурнага вершаскладання. Таму ўяўляецца немагчымым прымяняць да аналізу вербальных тэкстаў народных песень метады літаратуразнаўства ў іх чыстым выглядзе. Больш прадуктыўным шляхам даследавання з'яўляецца пошук праяў варыянтнасці, якія адпавядаюць самой прыродзе народнапесеннага каляндарна-абрадавага фальклору беларусаў.

Усе творы фальклору існуюць у варыянтах. Кожны варыянт з'яўляецца адносна самастойным творам, адзінкай фальклорнай песеннай парадыгмы і культуратворчага працэсу. Сацыякультурныя аспекты існавання і трансфармацыі песеннай традыцыі з'яўляюцца грамадскім базісам для мастацкай творчасці вуснай народнай традыцыі. Фальклорная песенная парадыгма аб'ядноўвае мноства варыянтаў адной мадэлі, якую ў фалькларыстыцы яшчэ прынята называць «інварыянтам». У якасці інварыянтнага (нязменнага, стабільнага, паказальнага для пэўнага тыпу песень) ядра выступае рытмаформула (ці, па-іншаму, складарытмічная мадэль) і абагульнены песенны сюжэт, што дазваляе сістэмна аналізаваць варыянты песень у адзінстве вербальнага і музычнага кампанентаў.

Параўнанне варыянтаў народных песень з'яўляецца прадуктыўным і неабходным пры даследаванні фальклору. Яго выніковасць даказана даследаваннямі І. І. Зямцоўскага, К. В. Квіткі, Я. У. Гіпіуса, М. І. Талстога, Дж. Бэйлі і многіх іншых навукоўцаў, даследчыкаў славянскага фальклору. Напрыклад, працы сусветна вядомага амерыканскага вершазнаўцы і фалькларыста прафесара Дж. Бэйлі [2] дэманструюць багатыя і не да канца выкарыстаныя магчымасці структурна-тыпалагічнага метаду, а таксама індуктыўнага віду абагульнення. Аўтар дэталёва даследуе метрыку і рытміку шматслаёвага спеўнага верша, аналізуе ўсе магчымыя складанасці іх перасячэння ў паўтараемых і непаўторных народных тэкстах. Гэты падыход, так званы рускі метад аналізу вершаванага рытму, які таксама можна назваць «лінгвастатыстычным метадам», абапіраецца на лінгвістычнае вывучэнне мовы і выкарыстоўвае статыстыку для выяўлення паўторных асаблівасцяў вершаванага рытму.

Такія навукоўцы, як Б. В. Тамашэўскі, Р. О. Якабсон, К. Ф. Тарноўскіх, А. М. Калмагораў [3], М. Л. Гаспараў, у межах навуковай дысцыпліны «матэматычнае вершазнаўства» распрацавалі аб'ектыўныя і дакладныя метады вывучэння народнага верша, якія сталі магчымымі пасля з'яўлення тэорыі інфармацыі і даюць лёгка верыфікуемыя вынікі.

Але ў дачынні да беларускага верша, песеннага фальклору падобных даследаванняў не праводзілася. Разам з тым, у працах такіх даследчыкаў як Я. У. Гіпіус, В. І. Ялатаў, А. С. Фядосік, Г. А. Барташэвіч, З. Я. Мажэйка, У. І. Раговіч, Т. Б. Варфаламеева, Т. В. Валодзіна і інш. практычныя назіранні і тэарэтычныя вывады носяць глыбокі характар і сталі вызначальнымі ў беларускай фалькларыстыцы [4]. Разглядаліся, у асноўным, пытанні міфарытуальнага, міфапаэтычнага і семантычнага характару. Аднак праца, звязаная з сістэмным аналізам вербальнага і музычнага кампанентаў песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы», іх варыянтнасці ў беларускай фалькларыстыцы не праводзілася.

Арэал песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы» ці «сулы» (сула, суліца – кап'ё), запісаных такімі фалькларыстамі, як Г. А. Барташэвіч [1], У. І. Раговіч [5], В. С. Новак [6] і інш., ахоплівае Пасожжа, а таксама тэрыторыю паміж Дняпром і Прыпяццю. Эпіцэнтр абраду – Веткаўшчына і суседнія тэрыторыі. Вытокі беларускай народнай палескай песні маюць старажытныя карані славянскай традыцыйнай культуры і вызначаюцца сваімі самабытнымі рэгіянальнымі, яскрава акрэсленымі асаблівасцямі. Магія гуку ў слове і напеве, магія дзеяння выяўляюцца на Беларусі з каласальнай сілай.

У якасці найбольш яркага і паказальнага, высокамастацкага прыкладу беларускай народнай песні са старажытнага аграрна-магіч-

нага язычніцкага абраду «Ваджэння і пахавання стралы» назавём песню «Ой, ідзі ж, стряла, дай уздоўж сяла», запісаную У. І. Раговічам і В. Д. Ліцвінкам у 1985 г. у в. Стаўбун Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці ад фальклорнага гурта ў складзе знаных спявачак 1910–1937 гадоў нараджэння [7, 68–71]. З прычыны навуковай каштоўнасці і ў якасці прыкладу прывядзем яе цалкам. Гэта веснавая песня-танок, якая спявалася ў час святочнага шэсця. Напеў уяўляе сабой прыклад тыповай формулы з групавым замацаваннем паэтычных тэкстаў.

ОЙ, ІДЗІ Ж, СТРЯЛА, ДАЙ УЗДОЎЖ СЯЛА




Ой, ідзі ж, стряла, дай уздоўж сяла,
Ох і вой, люлі, дай уздоўж ся… У!*
Ой, ідзі ж, стряла, ўперак вуліцы,
Ой, не ўбі, стряла, добра молайца,
Па том молайцу плакаць некаму,
Матка старэнька, сястра маленька,
Жана молада, кала горада,
Дзе маці плача – там рака цячэ,
Дзе сястрычанька – там крынічанька,
Дзе жана плача – там расы нема,
Ох і вой, люлі, там расы нем… Ух!

* Прыпеў "Ох і вой, люлі, дай уздоўж ся… У!" спяваецца пасля кожнага радка.

Песні абраду «Ваджэння і пахавання стралы», запісаныя на Гомельшчыне, характарызуюцца некалькімі агульнымі семантычнымі кодамі, якія закладзены ў змесце паэтычных тэкстаў, у форме і рытміцы мелодыка-вершавай страфы, а таксама ў рытмаінтанацыях. Разгледзім, як раскрываюцца ўніверсальныя заканамернасці будовы варыянтаў песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы».

Ключавы сюжэт песень веснавога каляндарнага абраду «Ваджэння і пахавання стралы» раскрываецца ў песнях з зачынам «Як пушчу стралу дай па ўсём сялу», «Ой, ідзі ж, стряла, дай уздоўж сяла». Сваім глыбокім сімвалічным зместам зачын адпавядае драматычнаму напаўненню песні, арганічна спалучаецца з яе зместам і дае абагульненае ўяўленне аб старажытнай язычніцкай веры нашых продкаў і ахоўнай магіі. Агульная паэтычная атмасфера моцнай калектыўнай замовы ад маланкі, стрэл Перуновых выразна дзейнічае і да сёняшняга часу.

Увогуле, вобраз стралы – вельмі цікавая тэма для асобнага даследавання. Ён мае сваё развіццё ў творчасці і міфалогіі славянскіх народаў, іншых народаў свету. Вобраз паўстае ў песнях і легендах, праз свядомасць асобных творцаў, народных майстроў ён пераходзіць у працы дойлідаў, рамеснікаў. Матыў «стралы» мы бачым у драўляным дойлідстве ў арнаментах, што ахоўваюць і ўпрыгожваюць месцы «над хатай», «над уваходам» у дзверы, вокны, брамы, вароты, «па чатырох кутах». Прычым ахоўная семантычная нагрузка матыву «стралы» часта спалучаецца ў малюнку арнаменту з сонечнымі і раслміннымі сімваламі, закліканымі выступаць у якасці стваральных сіл.

Асноўнай прычынай захавання зачыну ў народных песнях «Ой, ідзі ж, стряла, дай уздоўж сяла» з'яўляецца арганічная ўнутраная сувязь з тыповым зместам. Некаторая варыятыўнасць унутры зачыну не тычыцца яго вядучага вобразу і не парушае яго паэтычнага стылю, унутраных сувязяў з асноўным зместам песень, эмацыянальна раскрывае сутнасць таго, што выяўляецца.

Пяціскладовая, з акцэнтам на трэці склад, складарытмічная рытмаформула выступае ў якасці ўніверсальнай для песень «Ой, ідзі ж, стряла, дай уздоўж сяла», «Мы нясом стралу да й па ўсім сялу», «Пусці, татачка, ў зялён сад гуляць», «У майго таткі да жыць хараша», «Ляжыць брусейка, брусе новае», «Ох ты, ластаўка, ты касістая», «Ой, павейця-тка, ветры буйныя», «Як з-пад Кіява, з-пад Чарнігава» і іншых, якія па народнай традыцыі спяваюцца падчас абраду «Ваджэння і пахавання стралы». Яна гучыць і у час ваджэння шэсця «Стралы», карагодаў «Лука», «Дряма», «Крывога танка». Пры гэтым уражвае, што такая вялікая колькасць сюжэтаў песеннага аповеду аднолькава арганічна і ўдала бытуюць у форме пяціскладовіка.

У цэлым песням абраду «Ваджэння і пахавання стралы» характэрны заклікальны пяціскладовы рэфрэн «Ох і ой, люлі» («Ох і ой, лёлі», «Ох і я, люлі», «Ой-лі, вой люлі», «Вой люлі-люлі», «Лёлюшкі-лёлі», «Ой, лёлі-лёлі» і г. д.) і паўтор пасля яго другой часткі першага радка кожнай страфы.

Усе тэксты песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы» арганізаваны ў двухрадковыя строфы з рэфрэнам і паўтарэннем другой часткі першага радка – АБ, дакладней, абRб са словаабрывам і выклікам «У!» ці «Ух!», «Йх»), рытмічная структура верша – 5х4:

Ой, ідзі ж, стряла, дай уздоўж сяла,
Ох і вой, люлі, дай уздоўж ся… У!

Рытмаструктура верша варыянтаў песні мае форму чатыры разы паўторанай групы пяціскладовіка; суадносіны наступныя:

| Форма вершастрафы (ФВС) | А ці аб | Б ці Rб |
|---|---|---|
| Рытмаструктура верша (РСВ) | 5+5 | 5+5 |

Абрадавы песенны фальклор, у параўнанні з пазаабрадавым, мае менш магчымасцяў для максімальнай вобразнай дэталізацыі жыццёвых назіранняў, для праяўлення індывідуальнага пачатку кожным са спевакоў-стваральнікаў. А гэта значыць – для з'яўлення значнай колькасці адметных, самабытных варыянтаў. Але, абапіраючыся на законы калектыўнай вуснай народнай творчасці, індывідуальная свядомасць стварае самыя разнастайныя ўзоры каляндарна-абрадавай песеннасці. Некаторыя з іх паступова могуць перайсці ў пазаабрадавую сферу фальклору. Развіццё гісторыі і культуры народа вядзе да змен у грамадстве, свядомасці асобных людзей. Гэта ўздзейнічае ў першую чаргу на паэтычныя тэксты песень, таму што яны лягчэй відазмяняюцца ў сувязі з новымі эмоцыямі, абставінамі, мастацкімі густамі. Напеў, нягледзячы на наяўнасць вялікай колькасці вырыянтаў, заўсёды больш устойлівы і кансерватыўны. Таму часта сустракаецца адзін і той жа напеў з тэкстамі рознага зместу як у абрадавым, так і ў пазаабрадавым песенным фальклоры. Як толькі людзі перастаюць адчуваць адпаведнасць паміж зместам, эмоцыямі і тым, як гэта гучыць, спяваецца ў песні, яны пачынаюць паступова скарачаць, змяняць і прыстасоўваць тэкст да сваіх новых пачуццяў і думак, поглядаў і абставін жыцця. Першапачатковы напеў пры гэтым як правіла захоўваецца. Узнікае ці можа ўзнікнуць супярэчнасць паміж эмацыянальным, фабульным зместам напеву і зместам верша. У выніку якаснага змянення тэксту песня набывае новую функцыю і адбываецца яе эвалюцыя.

У працах беларускіх фалькларыстаў неаднаразова адзначалася сямейная тэматыка карагодных тэкстаў абраду «Ваджэння і пахавання стралы» [7, с. 56]. Прычым, яна мае разнастайнае ўвасабленне і развіццё адносін паміж членамі сям'і: 1) молайца, ягоных жонкі, маці, сястры, дзетак; 2) маці і сына; 3) сястры і брата; 4) нявесткі і свёкра; 5) бацькі і дачкі.

Чатыры песні абраду «Ваджэння і пахавання стралы», запісаных у в. Стаўбун Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці пачынаюцца з зачынаў «Як з-пад Кіява, з-пад Чарнігава», «Ой, у Кіяве і ў Чарнігаве». Сюжэты песень пры гэтым адрозніваюцца. У адным варыянце гэта баладны сюжэт, у якім «брат з сястрой ішоў» цераз рэчку, а «сястра ўтонула» (у другім тэксце з прыведзенага прыкладу) [7, с. 69–70]. Ён жа прысутнічае і ў песні «Ляжыць бруссейка, бруссе новае» (в. Шалухоўка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці) [7, с. 62]. У двух другіх песнях (в. Стаўбун Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці) з зачынам «Ой, у Кіяве, у Чарнігаве» развіваецца сюжэт ткання ручнікоў: «Ой, там пава палатно слала» [7, с. 69], «Ганна Паўлаўна ручнікі ткала» [7, с. 69].

Аналіз музычнага складу песень паказаў, што ў пераважнай большасці варыянтаў структуры напеву і песеннага рытму маюць аднолькавую форму:

РФ (рытмаформула) – аааа, дзе а=

.

Пяціскладовая, з акцэнтам на трэці склад, складарытмічная формула выступае ў якасці ўніверсальнай. Музычную аснову карагода «стралы» складае тыпавы напеў, які характэрны пераважнай большасці меладычных варыянтаў. Палешукі стварылі сваю самабытную, яркую, адкрыта-эмацыянальную, выключна ўстойлівую і жывую школу народных спеваў, якая садзейнічала ўзнікненню вялікай колькасці завершаных песенных структур і мастацкіх вобразаў-сімвалаў. Важнейшую частку песеннай творчасці народа складаюць адшліфаваныя тысячагоддзямі высокамастацкія напевы. Характэрная прыкмета абрадавых песень – тыпавы напеў (ТН) або напеў-формула (тып музычнай кампазіцыі, форма-мадэль, форма-схема).

Тыпавы напеў-формула – дасканалы вынік творчага шматвекавога развіцця і адбору ладапапевак (рытмаінтанацый). Тыпавыя формульныя напевы ўстойлівыя, маюць выключна высокую энергетычную канцэнтрацыю і абагульненасць рытмаінтанацый, валодаюць вялікай мастацка-выразнай сілай. Яны складаюць інтанацыйны слоўнік традыцыйнага народнапесеннага мастацтва, які застаецца выключна ўстойлівым у гісторыка-культурным працэсе на працягу тысячагоддзяў. Рухомасць і зменлівасць тыпавых напеваў выяўляюцца ў меладычным, ладавым і рытмічным вар'іраванні.

Кульмінацыя звычайна, згодна з логікай развіцця, знаходзіцца ў 3-й частцы напеву. Гукарады напеваў характарызуюцца багаццем і разнастайнасцю, уключаюць ад 4 да 7 ступеняў. Для ладавай будовы характэрна мінорнае нахіленне, апора на квартовыя, квінтовыя ладавыя папеўкі.

Меластрафічная варыянтнасць знайшла сваё адлюстраванне ў натацыях: варыянты элементаў напеву пазначаны маленькімі нота-

мі ў дужках пасля нот, што найбольш часта гучалі ў распевах строф. Устойлівыя паэтычныя і рытмаінтанацыйныя формулы, праз якія перададзены тыпізаваны змест, абавязкова маюць варыянты свайго выяўлення. У групе абрадавых песень мелатыпавая варыянтнасць валодае больш агульнай тыпізацыяй, у адрозненне ад пазаабрадавых песень. У межах аднаго тыпу яна спалучаецца з меластрафічнай варыянтнасцю. Абагульненыя песенныя сюжэты маюць варыянты разгортвання, кожны з якіх валодае фондам варыянтаў кампазіцыйных прыёмаў, вербальнага зместу і паэтыкі.

Пры рытмаструктурным адзінстве песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы» меладычнае, рытмічнае, ладавае і фактурнае іх напаўненне рознае. Адрозненні ў рытміцы ўтварыліся з-за распетасці асобных складоў у словах. Контуры гукавышыннай лініі вельмі разнастайныя ў хвалепадобным развіцці. У выніку распеваў (найбольш яскравая іх праява ў варыянтах з в. Стаўбун), развіліся ладавыя папеўкі, узмацнілася драматургічнае напружанне песень. Хуткасць і гнуткая дынаміка выканання песень неаднолькавыя, што ўказвае на разнастайнасць мыслення і творчых падыходаў спевакоў з розных вёсак. Сярод варыянтаў зафіксаваны як аднагалосыя, так і шматгалосыя песні. Харавое шматгалоссе ўзбагаціла напеў і пашырыла яго дыяпазон, зрабіла больш разнастайнай рэгістрава-тэмбравую палітру; у выніку мастацкага распеву ўзмацнілася драматургічнае развіццё.

Аналіз песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы» паказвае, што пры багатай разнастайнасці семантычных, марфалагічных і музычна-паэтычных асаблівасцяў усе варыянты песень утвараюць узаемазвязаную сукупнасць. Яе інварыянтным ядром выступаюць абагульненыя песенныя сюжэты і рытмаструктура, якія набылі featuresнабаковае семантычнае, мастацка-выразнае, паэтычнае, рытмаінтанацыйнае, ладавае і дынамічнае адлюстраванне. Дыялектныя моўныя і музычныя асаблівасці мыслення, стылі народнай школы спеваў зрабілі вельмі моцны ўплыў на стварэнне ўзораў народнапесеннай творчасці, што асабліва выразна назіраецца на прыкладзе розналакальных дыяхронных варыянтаў. Варыянтнасць песень абраду «Ваджэння і пахавання стралы» дазваляе прасачыць іх эвалюцыю і разнастайнасць, устанавіць пэўныя асаблівасці, характэрныя менавіта гэтаму роду беларускага песеннага фальклору.

*Літаратура*

1. *Барташэвіч, Г. А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 184 с.
2. *Бейли, Дж.* Избранные статьи по русскому народному стиху / Дж. Бейли; пер. с англ. под общ. ред. Л. М. Гаспарова. – М. : Языки русской культуры, 2001. – 416 с.
3. *Колмогоров, А. Н.* Труды по стиховедению / А. Н. Колмогоров; ред.-сост. А. В. Прохоров. – М. : МЦНМО, 2015. – 256 с.
4. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы : 60 год з дня заснавання / ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі» ; рэд. кал. А. І. Лакотка і інш. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – 240 с.
5. *Раговіч, У. І.* Песенны фальклор Палесся : у 3 т. / У. І. Раговіч. – Мінск : Выд-ва «Чатыры чвэрці», 2001–2002. – Т. 1 : Песні святочнага календара. – 2001. – 528 с.
6. *Новак, В. С.* Абраднасць і паэзія «пахавання стралы» / В. С. Новак. – Гомель : ГДУ імя Ф.Скарыны, 2002. – 268 с.
7. Беларускі фальклор у сучасных запісах : Традыц. жанры: Гомельск. вобл. / уклад. В. А. Захарава і інш.; уклад. муз. часткі У. І. Раговіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.

*References*

1. *Bartashevich, G. A.* Belaruskaya narodnaya paeziya vesnavoga tsykla i slavyanskaya falklornaya tradytsyya / G. A. Bartashevich. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1985. – 184 s.
2. *Beyli, Dzh.* Izbrannyye statyi po russkomu narodnomu stikhu / Dzh. Beyli; per. s angl. pod obshch. red. L. M. Gasparova. – M. : Yazyki russkoy kultury, 2001. – 416 s.
3. *Kolmogorov, A. N.* Trudy po stikhovedeniyu / A. N. Kolmogorov; red.-sost. A. V. Prokhorov. – M. : MTSNMO, 2015. – 256 s.
4. Instytut mastatstvaznaustva, etnagrafii i falkloru imya Kandrata Krapivy : 60 god z dnya zasnavannya / DNU “Tsentr dasledavannyau belaruskay kultury, movy i litaratury NAN Belarusi” ; red. kal. A. I. Lakotka i insh. – Minsk : Prava i ekanomika, 2017. – 240 s.
5. *Ragovich, U. I.* Pesenny falklor Palssya : u 3 t. / U. I. Ragovich. – Minsk : Vyd-va “Chatyry chvertsi”, 2001-2002. – T. 1 : Pesni svyatochnaga kalendara. – 2001. – 528 s.
6. *Novak, V. S.* Abradnasts i paeziya “pakhavannya straly” / V. S. Novak. – Gomel : GDU imya F. Skaryny, 2002. – 268 s.
7. Belaruski falklor u suchasnykh zapisakh : Tradyts. zhanry: Gomelsk. vobl. / uklad. V. A. Zakharava i insh.; uklad. muz. chastki U. I. Ragovich. – Minsk : Unoversitetskaye, 1989. – 384 s.